# Актуальна

## Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі ў сістэме медыяадукацыі: трансдысцыплінарны ракурс вывучэння СМІ

**Т. У. Падаляк,**
прафесар кафедры медыялогіі,
доктар філалагічных навук, дацэнт,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

*Укараненне найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) ва ўсе сферы дзейнасці, у тым ліку ў журналістыку, абумовіла з'яўленне новых аксіёлага-дэанталагічных праблем, маральных дылем і дыскусійных пытанняў медыясферы. Адукацыйным адказам на актуальныя (сацыяльныя і прафесійныя) выклікі сучаснасці стала вучэбная дысцыпліна «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі» (АДЖ), распрацаваная на кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта для студэнтаў магістратуры. Спецыфічнай характарыстыкай новай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца акцэнтаваная скіраванасць на праблематыку і зместавыя асаблівасці медыйнай практыкі, аксіялагічныя арыенціры і дэанталагічныя прынцыпы аналізу журналісцкай эмпірыкі, узмацненне ролі навукова-тэарэтычнай і практыкаарыентаванай падрыхтоўкі магістрантаў. Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі разглядаецца як трансдысцыплінарны ракурс вывучэння сродкаў масавай інфармацыі, узаемадзеянне і ўзаемаўплыў агульна-грамадскіх і канкрэтна-прафесійных каштоўнасцей.*

У манаграфіі «Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі» ўвага акцэнтавалася на сутнасным трыадзінстве журналістыкі як сацыякультурнага феномена: гэта і носьбіт грамадскіх ідэалаў, і форма інфармацыйна-каштоўнаснай рэтрансляцыі, і механізм прадуцыравання сацыяльных каштоўнасцей [1, с. 235]. Менавіта каштоўнасці з'яўляюцца прадметам вывучэння аксіялогіі (стар.-грэч. ἀξία – каштоўнасць) – інавацыйнай сістэмы ведаў, якая актыўна распрацоўваецца, тэарэтычна абгрунтоўваецца ў розных сферах навукі, у тым ліку ў журналістыцы. Сучасныя медыя становяцца адмысловай пляцоўкай выяўлення і эксплікацыі каштоўнасцей, што абумовіла акцэнтацыю і аб'ектывацыю аксіялагічнага ракурсу вывучэння СМІ.

Нягледзячы на тое, што пытанні прыроды каштоўнасцей у розных варыяцыях ставіліся на працягу ўсёй гісторыі цывілізацыі, пачынаючы са старажытнасці, абагульняльнага навуковага ўяўлення аб феномене каштоўнасці не было ажно да сярэдзіны XIX ст., калі на сістэмным узроўні пачала фарміравацца асобная навука аб каштоўнасцях. Тэрмін «аксіялогія» быў прапанаваны ў 1902 г. французскім педагогам-філосафам Полем Лапі (фр. Paul Lapie). Увага да аксіялагічнай праблематыкі прыкметна ўзрасла ў канцы XX ст.: ва ўмовах вырашэння пытанняў цывілізацыйнага выбару больш востра адчуваецца транзітыўнасць эпохі. Варта адзначыць, што каталізуюць сітуацыю «экалагічныя і тэхнагенныя катастрофы, маштабныя геапалітычныя пераўтварэнні і дэфармацыі: лакальныя войны, этнічныя канфлікты, тэрарызм, сацыяльныя выбухі, ідэалагічнае і інфармацыйнае супрацьстаянне. Узнікае аб'ектыўная неабходнасць выпрацоўкі найбольш аптымальных, тэхналагічна эфектыўных стратэгій развіцця і мадэрнізацыі айчыннай медыясферы, скарэляваных з нацыянальна-культурнымі традыцыямі» [2, с. 1–2].

Доўгі час журналістыка вывучалася разнавектарна: з пункту гледжання тэорыі і метадалогіі, тэхналогій творчасці, гісторыі, жанравай сістэмы, лінгвістыкі і г. д. Сёння на парадак дня ставіцца не толькі метадалагічнае, прадметнае, гістарычнае, але і аксіялагічнае вымярэнне медыйнай дзейнасці. Першай сістэматызаванай спробай тэарэтычнага абгрунтавання каштоўнаснага напрамку ў аналізе журналістыкі стала калектыўная манаграфія «Аксіялогія журналістыкі: вопыт станаўлення новай дысцыпліны» (2009) пад агульнай рэдакцыяй прафесара Інстытута «Вышэйшая школа журналістыкі і масавых камунікацый» Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта В. Сідарава [3]. Аўтары адзначаюць, што аксіялогія журналістыкі – гэта навуковая дысцыпліна, якая «вывучае журналістыку як крыніцу і рэтранслятар каштоўнасцей грамадства ва ўсёй іх прадметнасэнсавай разнастайнасці, а таксама ўласна журналістыку як сацыяльную каштоўнасць, якая даследуе прынцыпы і спосабы засваення журналістамі сацыякультурных каштоўнасцей, эфектыўнасць і метады іх рэпрэзентацыі аўдыторыі СМІ» [3, с. 12].

На наш погляд, можна вылучыць два ўзроўні каштоўнаснага вымярэння журналістыкі. З аднаго боку, журналістыка – каштоўнасць (культурная ўніверсалія) у аб'ектыўна-анталагічным сэнсе. З другога боку, яна выступае ўніверсальным сродкам-інструментарыем: рэтранслюе каштоўнасны дыскурс з эканомікі, палітыкі, культуры і мастацтва, сацыяльнай, маральнадухоўнай сферы і г. д. Разам з тым, ажыццяўляючы функцыю рэтрансляцыі каштоўнаснага дыскурсу, журналістыка выступае ў якасці механізму перавода разнастайных інфармацыйных патокаў у адмысловую форму, якая непасрэдна спажываецца рознымі мэтавымі аўдыторыямі СМІ.

Дэанталагічныя нормы журналістыкі бяруць вытокі непасрэдна ў журналісцкай практыцы, дзе назапашваецца і асэнсоўваецца жывы эмпірычны матэрыял, складваюцца прэцэдэнтныя феномены. Дэанталогія (ад грэч. *deon* – доўг, належнае) даследуе праблемы доўгу, норм належных паводзін, што выражаюць патрабаванні маральнасці ў форме прадпісанняў. Тэрмін быў уведзены Іерамія (Джэрамі) Бентамам (англ. Jeremy Bentham) у рабоце «Дэанталогія, або Навука аб маралі» (Deontology or the science of morality), апублікаванай у 1834 г.

Вядомы савецкі і расійскі даследчык Я. Прахараў адным з першых паспрабаваў абгрунтаваць дэфініцыю «дэанталогія журналістыкі». Згодна з трапнай заўвагай навукоўца, зместавае напаўненне гэтага паняцця ў дачыненні да журналістыкі «ў многім туманнае» [4, с. 214], паколькі ў яго ўкладваюць самыя розныя значэнні. Адны даследчыкі дэанталогіяй называюць правы, абавязкі, адказнасць журналіста, звязаныя перш за ўсё з асэнсаваннем і рэалізацыяй прынятых законаў; другія звязваюць дэанталогію з сістэмай этычных норм; трэція ўвязваюць заканадаўчыя нормы з этычнымі; чацвёртыя трактуюць гэтае паняцце як зводку і інтэрпрэтацыю прэцэдэнтаў «на мяжы» (і як праяву супярэчнасцей) норм заканадаўства і этыкі. І сапраўды, дэанталогія можа разглядацца «як шырокая сістэма норм, што вызначае характар ажыццяўлення інфармацыйнай палітыкі (нацыянальнай, дзяржаўнай, партыйнай і інш.) у сферы СМІ» [4, с. 215]; яна «нібыта адраджаецца да новага жыцця ў сувязі з актуальнай патрэбнасцю *ўбачыць цэласную сістэму розных норм, якія забяспечваюць годнае выкананне ўсяго аб'ёму абавязкаў, разглядаемых як прафесійны доўг у дэмакратычным грамадстве*» (курсіў аўтара. – *Т. П.*) [4, с. 215].

Даследчык В. Абішава ў рабоце «Дэанталогія журналістыкі: да гісторыі пытання» адзначае: «Вывучэнне метадалагічных асноў дэанталогіі як навуковай дысцыпліны дазваляе меркаваць, што па прычыне "маладосці" навуковага кірунку, адсутнасці комплексных мэтанакіраваных тэарэтычных даследаванняў, пэўнай сістэматызацыі ведаў, глыбокіх абгрунтаванняў і практычных напрацовак у поўнай ступені яна не сфармавалася» [5, с. 101]. Можна цалкам пагадзіцца, што прынцыпы і нормы дэанталогіі маюць непасрэдную сувязь з узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства, з грамадска-палітычным уладкаваннем дзяржавы, ладам жыцця, менталітэтам народа, нацыянальнымі і рэлігійнымі традыцыямі. В. Абішава прапануе разглядаць структуру журналісцкай дэанталогіі як сінтэз раўназначных аспектаў: прававога, які звязаны з усведамленнем норм дзеючага заканадаўства; этычнага, які праяўляецца ў кантактах журналістаў, у іх узаемадзеянні з рознымі групамі асоб пры падрыхтоўцы да творчага працэсу, пры апрацоўцы фактычнага матэрыялу; і вербальнага, які звязаны з творчай стадыяй працэсу: зносінамі журналіста

з адрасатам, літаратурным афармленнем тэксту і г. д. [5, с. 103].

Праблематыка аксіялогіі і дэанталогіі набывае павышаную метадалагічную і светапоглядную значнасць, становіцца асабліва запатрабаванай у XXI ст., паколькі дывергенцыя сацыяльных ідэалаў выяўляецца непасрэдна ў сферы каштоўнасцей і сэнсаў, фундаментальнага экзістэнцыяльнага выбару.

Вучэбная дысцыпліна «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі» пачала выкладацца ў 2019/2020 навучальным годзе. Яе мэта – фарміраванне сістэматызаваных ведаў аб аксіялогіі і дэанталогіі журналістыкі як тэарэтычнай і эмпірычнай дысцыпліне, выпрацоўка аксіёлагадэанталагічнай мадэлі прафесійнай культуры журналіста. Сярод асноўных прыярытэтаў – вызначэнне аксіялагічных арыенціраў і дэанталагічных прынцыпаў аналізу журналісцкай эмпірыкі, засваенне сучасных навукова-метадалагічных падыходаў і тэхналогій даследавання журналістыкі як галіны сучаснай гуманітарыстыкі, развіццё прафесійнай кампетэнтнасці, навыкаў самастойнага планавання і правядзення навуковых даследаванняў, здольнасці аб'ектыўна, комплексна, сістэмна аналізаваць і інтэрпрэтаваць з'явы медыйнай практыкі. Ставіцца задача, каб навучэнцы ўсведамлялі сацыяльную значнасць прафесіі, высокую маральна-этычную матывацыю, недапушчальнасць распаўсюджвання інфармацыі, якая разбурае нормы грамадскай маралі. Магістранты павінны валодаць навыкамі актуалізацыі атрыманых ведаў у рэдакцыйнай і даследчай працы, аксіялагічна абгрунтаванай методыкай усталявання прафесійна-этычных кантактаў з медыяэкспертамі ў працэсе тэарэтычных і эмпірычных даследаванняў сродкаў масавай інфармацыі.

«Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі» першапачаткова выкладалася ў другім семестры студэнтам магістратуры па спецыяльнасці 1-23 80 05 «Журналістыка», прафілізацыі: медыяменеджмент, тэлевізійная журналістыка. На яе вывучэнне адводзілася 90 гадзін, у тым ліку 34 гадзіны аўдыторнай працы: лекцыі – 8, семінарскія заняткі – 20, кіруемая самастойная работа (КСР) – 6, формай бягучай атэстацыі быў залік [6]. «Дэбютнае» выкладанне курса адбывалася ва ўмовах сусветнай пандэміі каронавіруснай інфекцыі: з красавіка 2020 г. навучанне вялося дыстанцыйна. Адзначым, што два кітайскія магістранты, якія не паспелі вярнуцца ў Рэспубліку Беларусь пасля зімовых канікул, адразу навучаліся дыстанцыйна, знаходзячыся ў «эпіцэнтры» каронавірусу – горадзе Ухань. Складаная эпідэміялагічная сітуацыя абумовіла пільную ўвагу да тэмы «Біяэтыка і журналістыка: аксіялагічныя і дэанталагічныя альтэрнатывы», праводзіўся падрабязны разгляд Усеагульнай дэкларацыі ЮНЕСКА аб біяэтыцы і правах чалавека (2005).

З 2023/2024 навучальнага года «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі» вывучаецца ў першым семестры магістрантамі спецыяльнасці 7-06-0321-01 «Журналістыка», прафілізацыі: журналістыка і медыятэхналогіі, новыя медыя (для замежных грамадзян). У вочнай форме атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі на яе вывучэнне адведзена 100 гадзін, у тым ліку 36 аўдыторных: лекцыі – 18, семінарскія заняткі – 14, КСР – 4, формай прамежкавай атэстацыі з'яўляецца экзамен [7].

Пры падрыхтоўцы і правядзенні заняткаў выкарыстоўваюцца розныя арганізацыйна-метадычныя мадэлі з улікам разнастайнасці ўзаемаабумоўленых вектараў і кірункаў: тэхналагічных, камунікацыйных, уласна творчых, лінгвастылістычных і г. д. Акрамя класічных форм правядзення заняткаў, выкарыстоўваюцца інтэрактыўныя методыкі і прыёмы, якія прадугледжваюць як дыялог, так і палілог паводле медыйнай практыкі, што садзейнічае творчай актыўнасці магістрантаў – даследчыкаў медыясферы, істотна ўплывае на ўзровень пастаноўкі навуковых і адукацыйна-выхаваўчых задач. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца актуалізацыі сітуацый маральнага выбару, пошуку канструктыўных рашэнняў у складаных прафесійных абставінах, аналізу аксіялагічных праблем і дэанталагічных дылем журналісцкай дзейнасці. І гэта невыпадкова, паколькі прафесійны статус журналіста прадугледжвае пастаяннае вырашэнне антыномій маральнага выбару – усвядомленага выбару таго ці іншага сцэнарыю паводзін у адпаведнасці з асабістымі маральнымі ўстаноўкамі. Гэта самавызначэнне асобы ў дачыненні да маральнай матывацыі, сістэмы каштоўнасцей, аксіялагічнай арыентацыі і ўласнай пазіцыі. Робячы выбар, журналіст аддае перавагу маральным каштоўнасцям або адступаецца ад іх дзеля мэтазгоднасці, практычнага поспеху, асабістых інтарэсаў і выгады. Так, на працягу доўгага часу вядзецца палеміка адносна вядомага здымка «Голад у Судане», за які амерыканскі

журналіст Кевін Картэр (англ. Kevin Carter) атрымаў Пулітцараўскую прэмію (англ. Pulitzer Prize) – адну з самых прэстыжных узнагарод ЗША ў галіне журналістыкі. Вясной 1993 г. Картэр прыляцеў у Судан здымаць сцэны голаду. У полі, парослым дробным хмызняком, ён пачуў ціхі плач і ўбачыў знясіленую дзяўчынку, якая памірала ад голаду. За яе спінай сядзеў грыф-сцярвятнік. Асцярожна, каб не спудзіць птушку, Кевін зрабіў некалькі здымкаў і чакаў, калі грыф расправіць крылы і з'явіцца магчымасць зрабіць больш эфектны кадр… Газета The New York Times купіла фотаздымак, які стаў сімвалам гаротнага становішча ў Афрыцы і адразу зрабіў Кевіна Картэра знакамітым. А што здарылася з дзяўчынкай, чаму фатограф ёй не дапамог? Гэтыя пытанні гучалі ўсё часцей. Кевіна параўноўвалі са сцярвятнікам на здымку: чалавек, які спакойна наладжвае свой аб'ектыў, каб зняць пакуты маленькай дзяўчынкі, – нібыта яшчэ адзін сцярвятнік. Глыбокая дэпрэсія прывяла 33-гадовага фотарэпарцёра да самагубства, ён звёў рахункі з жыццём у ліпені 1994 г., праз тры месяцы пасля атрымання Пулітцараўскай прэміі.

Ці можа журналіст грэбаваць маральнымі нормамі дзеля выканання прафесійнага доўгу? Гэтае пытанне застаецца актуальным, журналісты працягваюць аналізаваць магчымыя аргументы «за» і «супраць». Адны перакананыя: слёзы рэпарцёра павінны заставацца за кадрам, паколькі мэта журналістыкі – данесці да аўдыторыі глыбіню чужых пакут, а гэта нельга зрабіць, аддаўшыся ўласным эмоцыям. Матывацыя: хіба свет спазнаў бы ў поўнай ступені трагедыю Судана, калі б Кевін Картэр адкінуў сваю камеру і пачаў ратаваць дзяўчынку? Другія, наадварот, шакаваны «фотаканібалізмам», матывацыя: прыклад Кевіна Картэра паказвае, як далёка можна зайсці ў пагоні за поспехам і грашыма, гэта ператварае журналістыку ў нейкі Калізей з паміраючымі гладыятарамі і цікаўнай публікай. Дарэчы, здымак «Голад у Судане» стаў прадметам дыскусіі ў папулярнай рубрыцы «Спор-площадка» газеты «Советская Белоруссия» за 11 красавіка 2009 г.

Навучэнцам прапаноўвалася паразважаць на тэму «Прафесіяналізм і маральны выбар журналіста». Вось пункт гледжання магістранта з КНР Лі Юаня (2021 г.): «Я думаю, что требования к журналистам одинаковы в каждой стране. Этика – то, что можно легко персонализировать. Главное в установлении этических стандартов – это ответственность государства перед народом и уважение его права знать. Вот как я это понимаю. Из всех стандартов больше всего меня тронул баланс между истиной и личным субъективным осознанием. Знаменитый снимок "Голод в Судане", который мой учитель разбирал на лекции, является очень типичным примером. Автор фото, журналист Картер, решил покончить жизнь самоубийством из-за общественного мнения. Должны ли мы, журналисты, нести правду людям или следовать за своим сердцем, чтобы помочь другим? Ответ, который я дал на уроке, был таким: сначала сделать снимок, а потом помочь. Сделать снимок первым – это мое уважение к фактам новостей и этическим нормам журналиста. Но я потом иду помогать другим, это и есть моя человеческая этика… Кроме того, мы не являемся спасателями. Картер также не был спасателем. Если он может спасти одного, то может ли он спасти многих? Как журналист, фотограф, я знаю: все должно быть основано на правде».

Падобную (канкрэтна-прафесійную) пазіцыю падзяляюць многія. Прынамсі, «Голад у Судане» – не адзінае «шокавае» фота ў гісторыі сусветнай журналістыкі. Жудасныя наступствы вывяржэння вулкана ў Калумбіі ў 1985 г. атрымалі шырокі розгалас ва ўсім свеце дзякуючы фатаграфіі маленькай дзяўчынкі Амайры Санчаз (ісп. Omayra Sánchez Garzón): яна, заціснутая бетоннымі канструкцыямі ў смяротную пастку, тры дні памірала пад аб'ектывамі фота- і тэлекамер: вызваліць яе не змаглі нават прафесійныя ратавальнікі. І падобныя прыклады можна доўжыць.

Магістрантам прапануецца таксама выступіць у ролі медыяэкспертаў. На падставе даследавання сродкаў масавай інфармацыі яны фарміруюць медыядасье (партфоліа): сістэмна аналізуюць тэматыку, праблематыку і зместавыя асаблівасці сучаснага медыяпрацэсу ў друкаваных, аўдыёвізуальных, інтэрнэт-СМІ ў кантэксце абранай тэмы магістарскай дысертацыі. Пры ацэнцы аксіёлага-дэанталагічнага аналізу медыяпрактыкі звяртаецца ўвага на абгрунтаванасць і лагічнасць прадстаўлення канкрэтных медыяработ, наяўнасць самаацэнкі ўласных творчых і навукова-даследчых прац.

У цэнтры асаблівай увагі застаецца аксіёлага-дэанталагічны аналіз журналістыкі як крыніцы і рэтранслятара каштоўнасцей грамадства.

Напрыклад, у ходзе навучання магістранты выконваюць эўрыстычнае заданне – падрыхтоўка навукова-даследчага эсэ паводле дынамікі медыякаштоўнасцей. Вось вытрымкі з работ магістрантаў прафілізацыі «Новыя медыя» – яны аналізавалі асноўныя каштоўнасці кітайскага грамадства, якія адлюстроўваюцца ў сродках масавай інфармацыі КНР (лістапад 2024 г.).

**Чжан Хэнюй:**

«Анализ основных ценностей в СМИ КНР предоставляет богатую картину культурных и социальных ориентиров современного китайского общества. СМИ отражают приоритеты общества, которое придерживается таких ценностей, как коллективизм, уважение к старшим, социальная гармония, образование, усердие, глубокая связь с традициями и культурой. Это помогает создать единую культурную идентичность среди всего населения страны.»

**Хань Юйшань:**

«Анализ основных ценностей китайского общества, освещаемых в средствах массовой информации КНР, можно провести через несколько ключевых аспектов, которые часто подчеркиваются в новостях, статьях и других публикациях. В Китае сильна ценность коллективизма, что подразумевает важность группы (семьи, сообщества, нации) над индивидуальными интересами. Семья считается основой общества: в китайских СМИ акцентируются традиционные семейные ценности, такие как уважение к старшим, забота о детях и поддержка друг друга в трудные времена. Образование занимает центральное место в жизни китайцев: в СМИ много внимания уделяется достижениям в образовании, конкуренции в учебе и важности знаний для личного и общественного развития.»

**Чжай Цилун:**

«Китайское общество характеризуется рядом ключевых ценностей, которые формируют социальное сознание и определяют поведение граждан. СМИ подчеркивают важность патриотизма и национальной гордости. Это включает поддержку государственных программ и инициатив, которые направлены на укрепление национальной идентичности и безопасности. С учетом современных вызовов, китайские СМИ все чаще поднимают вопросы экологической устойчивости. Пропаганда ценностей бережного отношения к природе и устойчивого развития становится актуальной в контексте глобальных изменений климата и охраны окружающей среды.»

**Ян Явэнь:**

«Приоритетные ценности китайского общества отражены в основных ценностях социализма, которые являются концентрированным выражением духа современного Китая и воплощают стремление всех людей к общим ценностям. Это процветание, демократия, цивилизация и гармония (на национальном уровне); свобода, равенство, справедливость и верховенство закона (на социальном уровне), а также патриотизм, самоотверженность, честность, дружелюбие (на уровне отдельного гражданина). Эти ценности широко распространяются через медиа, образование, рекламу, культурную продукцию.»

**Чэнь Аочэн:**

«Китайская культура и традиции играют важную роль в формировании ценностей общества. СМИ освещают культурные события, традиции и исторические достижения. Примеры: репортажи о праздниках, таких как 春节 (Весенний фестиваль), обсуждение философских учений, таких как конфуцианство. В последние годы наблюдается рост интереса к социальной политике и благосостоянию граждан. СМИ освещают вопросы здравоохранения, образования и социальной защиты. Примеры: репортажи о государственных программах по улучшению качества жизни, доступу к медицинским услугам и обеспечению социальной справедливости.»

**Ли Юйчэнь:**

«В китайских СМИ подчеркивается важность социальной стабильности как основы для экономического роста и процветания. Это связано с историческим контекстом, когда нестабильность приводила к значительным последствиям для общества. Концепция “социальной гармонии” активно пропагандируется, включая идеи о взаимопомощи и сотрудничестве между различными слоями общества. СМИ освещают достижения Китая, подчеркивая значимость инноваций и технологий как основного двигателя прогресса. Это связано с концепцией «китайской мечты», которая подразумевает улучшение жизненного уровня населения, национальной гордости и экологической устойчивости. Ценности китайского общества, освещаемые в средствах массовой информации, формируют уникальный аксиологический портрет, который акцентирует внимание на социальной гармонии, коллективизме, экономическом развитии.»

З'яўленне вучэбнай дысцыпліны «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі» ў сістэме падрых-

тоўкі спецыяліста з паглыбленай вышэйшай адукацыяй (магістра) цалкам абгрунтаванае і своечасовае: з развіццём тэхналогій істотна мадэрнізуюцца формы і спосабы журналісцкай дзейнасці, узнікаюць новыя медыйныя калізіі і прэцэдэнты «на мяжы», таму ўвага да аксіёлага-дэанталагічнай праблематыкі ўзрастае. Як справядліва падкрэслівае даследчык В. Абішава, «задача развіцця журналістыкі не можа быць абмежавана "тэхналагічнымі аспектамі" і прававымі нормамі. Надзвычай надзённай з'яўляецца праблема фарміравання прафесійнай культуры журналіста, выхавання пачуцця доўгу і адказнасці… Пытанне асабліва актуальнае ў цяперашні час, калі журналістыка становіцца адлюстраваннем дысгармоніі сацыяльных сувязей, нестабільнага становішча чалавека ў свеце» [5, с. 102]. Не выклікае сумнення, што ў працэсе адлюстравання і творчай інтэрпрэтацыі сацыяльнай рэчаіснасці важную ролю адыгрываюць каштоўнасныя ўстаноўкі журналіста, якія істотна ўплываюць на пастаноўку мэтаў прафесійнай дзейнасці, характар і формы яе ажыццяўлення.

Вучэбная дысцыпліна «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі» яшчэ больш актуалізавалася ў кантэксце экзістэнцыяльных выклікаў 2020 г. Даследчык К. Нігматуліна слушна адзначае: «Аксіялагічныя праблемы ўзнімаюцца ў навуцы і ў грамадстве ў перыяды аб'ектыўных крызісаў агульначалавечага светаадчування» [8]. У гэтых умовах важна адэкватна ацэньваць медыякантэнт, фарміраваць актуальныя ўяўленні аб каштоўнасным змесце медыясферы, выкарыстоўваць карэктныя прыёмы аналізу журналісцкай інфармацыі, вызначаць абгрунтаваную методыку ўсталявання прафесійна-этычных кантактаў, вядзення дыскусіі, палемікі, дыялогу і палілогу пры вырашэнні праблемных сітуацый медыяпрактыкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Падаляк, Т. У.* Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі / Т. У. Падаляк; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2016. – 263 с.

2. *Падаляк, Т. У.* Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі: аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук: 10.01.10 / Падаляк Таццяна Уладзіміраўна; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2019. – 49 с.

3. *Сидоров, В. А.* Аксиология журналистики: опыт становления новой дисциплины / В. А. Сидоров, С. С. Ильченко, К. Р. Нигматуллина; под общ. ред. В. А. Сидорова. – Санкт-Петербург: Роза мира, 2009. – 174 с.

4. *Прохоров, Е. П.* Журналистика и демократия / Е. П. Прохоров. – 2-е изд., доп. – Москва: РИП-холдинг, 2001. – 296 с.

5. *Абишева, В. Т.* Деонтология журналистики: к истории вопроса / В. Т. Абишева // Вестник Карагандинского государственного университета. Серия: Филология. – 2011. – № 3 (63). – С. 99–104.

6. Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі: вучэб. праграма ўстановы выш. адукацыі па вучэб. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 80 05 «Журналістыка»; прафілізацыі: медыяменеджмент, тэлевізійная журналістыка / Т. У. Падаляк // Рэгістрацыйны № УД-7864/вуч. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2020. – 23 с.

7. Аксиология и деонтология журналистики: учеб. программа учреждения высш. образования по учеб. дисциплине для специальности: 7-06-0321-01 «Журналистика»; профилизации: журналистика и медиатехнологии, новые медиа (для иностранных граждан) / Т. В. Подоляк // Регистрационный № УД-728/м – Минск: Белорус. гос. ун-т, 2023. – 27 с.

8. *Нигматуллина, К. Р.* Аксиология в журналистике: пересекающиеся измерения / К. Р. Нигматуллина // Вестник Санкт-Петербургского университета. Серия 9. – 2008. – Вып. 1. – С. 140–146.

**Анатацыя**

У артыкуле абгрунтоўваецца неабходнасць распрацоўкі аксіёлага-дэанталагічнай мадэлі прафесійнай культуры журналіста ў сувязі са з'яўленнем новых маральных дылем і дыскусійных пытанняў медыясферы. Адукацыйным адказам на актуальныя выклікі сучаснасці стала вучэбная дысцыпліна «Аксіялогія і дэанталогія журналістыкі», распрацаваная на кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта для студэнтаў магістратуры.

**Abstract**

The article justifies the need to develop an axiological-deontological model of the professional culture of a journalist in connection with the emergence of new moral dilemmas and debatable issues in the media sphere. The educational response to the current challenges of our time has become the academic discipline "Axiology and Deontology of Journalism", developed at the Department of Medialogy of the Faculty of Journalism of the Belarusian State University for master's students.